Справа выбару

Грамадска-адукацыйны праэкт

Модуль 8



# ПРАМАЯ ДЭМАКРАТЫЯ

~ 3 хвіліны, 4 старонкі

# ПРЫНЦЫПЫ

## Прамая дэмакратыя — гэта форма праўлення, пры якой усе грамадзяне ўдзельнічаюць у прыняцці рашэнняў па важных пытаннях грамадскага жыцця.

Для параўнання: у прадстаўнічай дэмакратыі людзі выбіраюць сваіх упаўнаважаных у парламент ці іншыя органы ўлады і давяраюць гэтым абраным людзям прымаць рашэнні.

Самы распаўсюджаны прыклад прамой дэмакратыі — гэта рэферэндум, то бок такая працэдура, якая дазваляе грамадзянам непасрэдна вырашаць тое ці іншае пытанне. Вось вам цікавы факт: бывае, яны тычацца ўсей краіны або распаўсюджваюцца лакальна на нейкі рэгіён, вобласць ці горад. Але гэта ўсё ж такі рэферэндумы. А яшчэ яны бываюць абавязковыя і неабавязковыя.

**РЭФЕРЭНДУМЫ ДАЮЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВУ МАГЧЫМАСЦЬ ПРАМОГА ГАЛАСАВАННЯ ЗА НЕЙКАЕ ПЫТАННЕ, ВЫНІКІ ЯКОГА МОГУЦЬ МЕЦЬ АБАВЯЗКОВЫ АБО РЭКАМЕНДАЦЫЙНЫ ХАРАКТАР**

Галасаванне можа праводзіцца па канкрэтным палітычным, канстытуцыйным або заканадаўчым пытанні. Важна разумець, што найчасцей гэтыя пытанні прапануюць да разгляду кіруючыя  інстытуты, напрыклад прэзідэнт, урад, парламентамі і г. д.

Звычайна, народ галасуе за прыняцце або адмену рашэнняў і прапаноў, якія гэтыя інстытуты прынялі раней. Каб ніхто не падпарадкоўваўся правілам, навязаным іншымі людзьмі, народ павінен мець магчымасць кантраляваць свой уласны лёс. Падрабязней пра гэта мы распавядалі ў адукацыйным модулі 1 на сайце vybar.org.

# ПЛЕБІСЦЫТ ЯК ФОРМА ПРАМОЙ ДЭМАКРАТЫІ

Плебісцыт звычайна праводзіцца па ініцыятыве ўрада па асабліва важных або спрэчных пытаннях, такіх як незалежнасць, змена дзяржаўнага ладу або адстаўка прэзідэнта. Рэферэндумы часта маюць юрыдычна абавязковы характар і патрабуюць дасягнення пэўнай яўкі або кваліфікаванай большасці для ўступлення вынікаў у сілу. Напрыклад, у 2014 годзе ў Шатландыі прайшоў плебісцыт аб незалежнасці ад Вялікабрытаніі, які НЕ атрымаў падтрvымкі большасці тых, хто галасаваў. У 2017 годзе ў Каталоніі адбыўся плебісцыт аб незалежнасці ад Іспаніі, які быў прызнаны незаконным іспанскім урадам і не быў прызнаны міжнароднай супольнасцю.

# ЗНІЗУ ЎВЕРХ! РЭФЕРЭНДУМ АД НАРОДА

А ёсць рэферэндумы, якія з’яўляюцца грамадзянскімі ініцыятывамі і сродкам ініцыявання народнага галасавання «знізу ўверх», але гэты тып прамой дэмакратыі найменш папулярны. Грамадзяне маюць права прапаноўваць свае праекты законаў або паправак да існуючых законаў і патрабаваць іх разгляду парламентам. Неабходна сабраць пэўную колькасць подпісаў у падтрымку ініцыятывы на працягу вызначанага тэрміну. Народныя заканадаўчыя ініцыятывы шырока распаўсюджаны ў Швейцарыі, дзе яны выкарыстоўваюцца для ўнясення паправак у канстытуцыю або іншыя акты заканадаўства па розных тэмах, такіх як іміграцыя, падаткі, экалогія і г. д.

# У ПРАМОЙ ДЭМАКРАТЫІ ЁСЦЬ СВАЕ ПЛЮСЫ:

Яна садзейнічанне ўдзелу грамадзян у прыняцці дзяржаўных рашэнняў.

Такі досвед дапамагае людзям пераступіць праз асабістыя праблемы і заахвочвае іх станавіцца лепшымі грамадзянамі.

Рэферэндумы даюць права голасу і кантролю шараговым грамадзянам. Выбраныя прадстаўнікі, заняўшы сваю пасаду, могуць забыцца на інтарэсы грамадзян.

Рэферэндумы, ініцыяваныя меншасцю, могуць стаць спосабам разгледзець пытанні, з якімі дзейны ўрад ці заканадаўчая большасць не хацелі б сутыкацца.

Прамая дэмакратыя з'яўляецца выказваннем народнага суверэнітэту — права грамадзян прымаць рашэнні без пасрэдніцтва сваіх прадстаўнікоў.

Гэта можа быць вельмі важным для ключавых рашэнняў, такіх як стварэнне новай дзяржавы ці канстытуцыі.

# У ПРАМОЙ ДЭМАКРАТЫІ ЕСЦЬ І МІНУСЫ:

Няма ўпэўненасці, што грамадства дастаткова інфармаванае і кампетэнтнае для галасавання па многіх пытаннях.

Невыразная фармулёўка пытання на рэферэндуме можа прывесці да вельмі незразумелых вынікаў.

Калі механізмы прамой дэмакратыі выкарыстоўваюцца занадта часта ці прымяняюцца для вырашэння тэхнічных пытанняў, узнікае рызыка, што выбарцы стомяцца.

Рэферэндумы і ініцыятывы могуць паглыбляць раскол у грамадстве, пагражаць правам меншасцяў, узмацняць расавую, этнічную, моўную ці рэлігійную напружанасць.

Палітыкі могуць выкарыстоўваць рэферэндумы, каб пазбегнуць адказнасці за вырашэнне складаных пытанняў (але ці маюць яны права вызваляць сябе ад абавязку кіраваць краінай і ад адказнасці перад грамадствам за наступствы сваіх рашэнняў?)

Гістарычна аўтарытарныя кіраўнікі, такія як Напалеон у Францыі, Франка ў Іспаніі, Пінačэт у Чылі, Маркас на Філіпінах, выкарыстоўвалі неканкурэнтныя рэферэндумы для стварэння ілжывай бачнасці дэмакратычнай легітымнасці. Плебісцыт таксама можа дазволіць папулісцкім лідэрам абысці заканадаўчыя, судовыя або канстытуцыйныя абмежаванні на ўладу, апелюючы да мас. Рэферэндумы выкарыстоўваліся для апраўдання так званага сама-перавароту, маргіналізацыі ўнутранай палітычнай апазіцыі ці адмены канстытуцыйных забаронаў на перавыбранне. Аднак часам аўтарытарнае злоўжыванне рэферэндумамі можа прывесці да адваротнага выніку. Напрыклад, у 1988 годзе Пінačэт нечакана прайграў рэферэндум аб падаўжэнні тэрміна сваіх паўнамоцтваў і неўзабаве пасля гэтага яго рэжым паў.

Арганізацыя рэферэндуму патрабуе значных затрат. Можа ўзнікнуць вялікая матэрыяльна-тэхнічная нагрузка на выбарчыя органы, мясцовыя ўлады, службы бяспекі і іншыя дзяржаўныя структуры. Акрамя таго, правядзенне плебісцыту патрабуе значных намаганняў па грамадзянскай адукацыі і ўцягванні ў працэс палітычных партый і агітацыйных груп. У краінах, якія развіваюцца, дзе рэсурсы абмежаваныя, а галасаванне можа быць спалучана з гвалтам, частае выкарыстанне прамой дэмакратыі можа апынуцца немэтазгодным.

Сёння ўсё часцей гавораць не пра прамую дэмакратыю ў класічным разуменні, а пра дарадчую, ці дэмакратыю ўдзелу. Гэта новыя метады ўцягвання грамадзян у прыняцце рашэнняў, дзе людзі самі найперш абмяркоўваюць пытанні і даюць рэкамендацыі ўладам. Напрыклад:

Агульнагарадскія сходы, дзе можна пачуць меркаванні любога, хто жадае выказацца.

Краўдсорсінг — збор онлайн розных прапаноў па якой-небудзь тэме і звычайна іх наступная ацэнка онлайн.

Грамадзянскае журы — прысяжныя або калегія могуць быць скліканыя, каб заслухаць доказы, абмеркаванні і выпрацаваць рэкамендацыі.

Петыцыі — працэс, калі група грамадзян можа прапанаваць нейкае пытанне да галасавання і разгляду парламентам ці ўрадам. Звычайна неабходна сабраць вызначаную колькасць подпісаў для таго, каб дзяржаўны орган быў абавязаны разгледзець прапанаванае пытанне.

Грамадзянскія асамблеі — спецыяльная працэдура, прызначаная для таго, каб прыцягнуць людзей да распрацоўкі і прыняцця рашэнняў органамі мясцовага самакіравання або органамі дзяржаўнай улады. Гэта азначае, што выпадкова выбраныя людзі, якія адпавядаюць пэўным крытэрыям (напрыклад, 50% жанчын і 50% мужчын) запрашаюцца да абмеркавання зададзенага пытання. Асноўная мэта — прадставіць зацікаўленай грамадскасці магчымасць ўдзелу ў прыняцці рашэнняў і кантролю за выкананнем выпрацаваных рэкамендацый.

Грамадзянскае журы — прысяжныя або калегія могуць быць скліканыя, каб заслухаць доказы, абмеркаванні і выпрацаваць рэкамендацыі.

Партысіпатыўнае бюджэтаванне — можа быць розным па накіраванасці і маштабе, але гэты інструмент супольнасці, якія збіраюцца для размеркавання бюджэту на ініцыятывы або паслугі, якія непасрэдна закранаюць іх інтарэсы.

Суседскія форумы — вочныя сустрэчы ў малых групах, звычайна з удзелам грамадзян, службовых асобаў і прадстаўнікоў мясцовых уладаў.

Хакатоны — сумесныя творчыя сустрэчы, на якіх людзі з розных сфер дзейнасці актыўна ствараюць прататыпы рашэння. Упершыню яны ўзніклі сярод распрацоўшчыкаў праграмнага забеспячэння з адкрытым выходным кодам у канцы 1990-х гадоў і з таго часу выкарыстоўваюцца для вырашэння сацыяльных і дэмакратычных праблем.

Глыбокая дэмакратыя — пагружэнне ў дарадчыя працэсы, дзе ўдзельнікі з істотна супрацьлеглымі (нават варожымі) поглядамі збіраюцца, каб выслухаць, абмеркаваць і вырашыць рознагалоссі. Гэтая мадэль выкарыстоўвалася ў канфліктах і для пераадолення складаных і спрэчных пытанняў.

## ДЭМАКРАТЫЯ ЎДЗЕЛУ ДАПАЎНЯЕ І ПАДТРЫМЛІВАЕ ПРАДСТАЎНІЧУЮ ДЭМАКРАТЫЮ

Грамадзяне, якія адчуваюць, што яны маюць права голасу пры прыняцці рашэнняў, якія іх закранаюць, з большай верагоднасцю пагодзяцца з імі і будуць больш давяраць свайму ўраду і абраным прадстаўнікам.

Грамадска-адукацыйны праект «Справа выбару»
vybar.org

Справа выбару